ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 7 (1043) ● ЧАЦВЕР, 28 лютага 1974 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.

**УЧОРА Ў МІНСКУ ПАЧАЎ СВАЮ РАБОТУ XXV З'ЕЗД КАМСАМОЛА БЕЛАРУСІ.**

**Універсітэцкую камсамольскую арганізацыю прадстаўляюць на з'ездзе сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч і студэнтка IV курса філфака Л. Тарасюк.**

## У ПАРТКОМЕ

Аб тым, як выконваецца пастанова бюро Мінскага гаркома КПБ «Аб стане выхаваўчай работы са студэнтамі, якія жывуць у інтэрнатах БДУ», партыйнаму камітэту далажыў на чарговым пасяджэнні старшыня прафкома А. М. Жылінскі.

У выніку абмеркавання гэтага пытання адзначана, што партыйныя бюро, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі факультэтаў праводзяць вялікую палітыка-выхаваўчую і культурна-масавую работу. Значна актывізавалася дзейнасць студсаветаў. Ва ўсіх інтэрнатах праводзяцца лекцыі па рознай тэматыцы, вечары адпачынку, сустрэчы, гутаркі з ветэранамі вайны і працы, дзеячамі літаратуры і мастацтва, выкладчыкамі і вучонымі.

Аднак у інтэрнатах пакуль не вядзецца мэтанакіраваная работа, каб выхаваць у студэнтаў беражлівыя адносіны да сацыялістычнай маёмасці, навыкі падтрымання правіл супольнага жыцця.

Пакуль рэдкая з'ява лекцыі аб дасягненнях сучаснай навукі і тэхнікі, літаратурныя дыспуты, абмеркаванні кінафільмаў і спектакляў. Ёсць недахопы і ў афармленні нагляднай агітацыі.

Партком патрабаваў ад партыйных бюро факультэтаў ліквідаваць выяўленыя недахопы, перагледзець і канкрэтызаваць планы палітыка - выхаваўчай работы, прыняць меры па паляпшэнню работы партыйных груп у інтэрнатах.

Вырашана на ўсіх факультэтах да 10 сакавіка правесці сходы студэнтаў, якія жывуць у інтэрнатах, па пытанню выканання правіл супольнага жыцця.

Таварыству «Веды» і камітэту камсамола прапанавана распрацаваць тэматыку лекцый спецыяльна для інтэрнатаў; бібліятэцы — папоўніць неабходнай літаратурай ленінскія пакоі.

## У РЭКТАРАЦЕ

Павестка дня чарговага пасяджэння рэктарата, якое адбылося 25 лютага, утрымлівала наступныя пытанні:

1. Аб ходзе выканання мерапрыемстваў па пастанове ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «Аб узмацненні аховы прыроды і паляпшэнні выкарыстання прыродных рэсурсаў рэспублікі».

2. Вынікі работы спартыўна-аздараўленчага лагера на возеры «Нарач» у 1973 годзе і мерапрыемствы спартыўна - аздараўленчага комплексу ў 1974 годзе.

3. Аб выкананні каштарысу расходаў за 1973 і бюджэтных асігнаванняў на 1974 год.

Па першаму пытанню з дакладамі выступілі дэкан біялагічнага факультэта А. Ц. Пікулеў і дэкан геаграфічнага факультэта М. Т. Раманоўскі, старшыня універсітэцкай арганізацыі таварыства «Аховы прыроды» І. К. Лапацін. Размова ішла аб праблемах, напрамках работы, магчымасцях і перспектывах яе правядзення ва універсітэце, практычным удзеле выкладчыкаў і студэнтаў у гэтай важнейшай справе.

Прарэктар па навуковай рабоце Л. В. Валадзько паведаміў, што ва універсітэце выканана каля 30 тэм па ахове прыроды. Распрацоўваюць гэтыя пытанні не толькі біёлагі і географы, але і фізікі. Аднак ёсць факты, якія гавораць аб тым, што парушаюцца элементарныя правілы аховы навакольнага асяроддзя. Мэтазгодна было б на факультэтах паставіць канкрэтныя задачы перад НСТ, прыцягнуць пачынаючых даследчыкаў спачатку да аховы асяроддзя, у якім працуе універсітэцкі калектыў.

Адзначыўшы важнасць абмяркоўваемага пытання, рэктар БДУ У. М. Сікорскі падкрэсліў, што універсітэт павінен тут быць на перадавых рубяжах. Неабходна мець у БДУ каардынацыйны цэнтр, прадумаць магчымасць арганізацыі аддзялення аховы прыроды на факультэце грамадскіх прафесій, увесці ў дзеянне і іншыя рэзервы.



Быццам зусім нядаўна пачаўся другі семестр, а ўжо глядзіш — трэба адказваць на семінарскіх і практычных занятках. На раскачку няма часу.

**На здымку:** практычныя заняткі па савецкаму крымінальнаму працэсу вядзе дацэнт **С. П. Бякешка.**

Фота **Д. Чаховіча.**

## КАРЫСНАЕ ПАЧЫНАННЕ

Адбылося сумеснае пасяджэнне кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў і бюро камітэта камсамола універсітэта з павесткай дня «Аб рабоце камсамольскага бюро гістарычнага факультэта па арганізацыі вывучэння гісторыі КПСС на І і ІІ курсах».

З дакладам аб рабоце ў гэтым кірунку выступіў сакратар камітэта камсамола гістфака Г. Хухлындзін. У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел члены кафедры, члены бюро камітэта камсамола, студэнты І і ІІ курсаў аддзялення гісторыі і філасофіі. У выступленнях выкладчыкаў Я. Л. Прыбытковай, У. В. Кузьмінава, студэнткі, ленінскай стыпендыяткі Г. Ільяшчук было адзначана, што на гістарычным факультэце вывучэнне гісторыі КПСС пастаўлена нядрэнна: першакурснікі прымаюць удзел у абмеркаванні дакладаў на пасяджэннях гістарычнага гуртка, на І і ІІ курсы накіраваны старшакурснікі з мэтай аказання практычнай дапамогі ў вывучэнні твораў класікаў марксізму-ленінізму і г. д.

На пасяджэнні была прынята пастанова, якая прадугледжвае распрацоўку камітэтам камсамола сумесна з выкладчыкамі кафедры перспектыўнага плана па ўдасканаленню форм масава-палітычнай работы.

У заключэнне выступіў намеснік загадчыка кафедры, прафесар М. Я. Шкляр. Ён падкрэсліў, што правядзенне падобных пасяджэнняў з запрашэннем студэнтаў — вельмі карысна. Такі цесны кантакт дазволіць ясней акрэсліць задачы, што стаяць перад кафедрай і камсамольскай арганізацыяй універсітэта па выхаванню будучых спецыялістаў.

## АБ'ЯЎЛЕН КОНКУРС

З мэтай шырокага прыцягнення прафесарска-выкладчыцкага і вучэбна-дапаможнага саставу, інжынерна-тэхнічных работнікаў, рабочых і служачых універсітэта да распрацоўкі і правядзення мерапрыемстваў па павышэнню культуры вытворчасці і аздараўленню ўмоў працы рэктарат і мясцовы камітэт аб'явілі конкурс па культуры вытворчасці і ахове працы на 1974 год.

Асноўнымі паказчыкамі пры ацэнцы культуры вытворчасці і аховы працы з'яўляюцца:

— укараненне новай тэхнікі і тэхналогіі, значна паляпшаючых умовы працы, механізацыі і аўтаматызацыі вытворчых працэсаў, герметызацыі абсталявання, дасканалых сістэм блакіроўкі і агарожы небяспечных вузлоў машын і механізмаў;

— выкананне мерапрыемстваў, уключаных у пагадненне па ахове працы, а таксама распрацоўка мерапрыемстваў і прапаноў на будучае;

— рацыянальная арганізацыя рабочых месц, якая забяспечвае высокапрадукцыйныя, здаровыя і бяспечныя ўмовы працы;

— забеспячэнне нармальнага стану паветранага асяроддзя і асвятлення, наяўнасць санітарна-бытавых памяшканняў, падтрыманне рабочых месц, карпусоў, памяшканняў лабараторый, кафедр і г. д. у адпаведнасці з правіламі тэхнікі бяспекі і санітарнымі нормамі;

— укараненне тэхнічнай эстэтыкі, выкананне рэкамендацый па рацыянальнай каляровай афарбоўцы займаемых памяшканняў і абсталявання;

— утрыманне і эксплуатацыя аб'ектаў павышанай небяспекі ў адпаведнасці з патрабаваннямі правіл тэхнікі бяспекі;

— здзяйсненне мерапрыемстваў па змяншэнню вытворчага шуму і вібрацыі да ўзроўню ніжэй дапусцімых норм;

— забеспячэнне супрацоўнікаў і студэнтаў спецадзеннем, спецабуткам, ахоўнымі сродкамі ў адпаведнасці з галіновымі нормамі;

— паляпшэнне масавай фізкультурнай работы і грамадскага харчавання супрацоўнікаў і студэнтаў;

— паніжэнне ўзроўню вытворчага траўматызму, адсутнасць выпадкаў траўматызму з вынікам інваліднасці;

— паляпшэнне навучання і нагляднай агітацыі па пытаннях бяспекі працы; арганізацыя куткоў па тэхніцы бяспекі.

Для правядзення агульнауніверсітэцкага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы і падвядзення яго вынікаў створана агульнауніверсітэцкая камісія ў саставе:

старшыня камісіі — прарэктар па вучэбнай рабоце А. Я. МАЛЫШАЎ, намеснік старшыні камісіі—старшыня мясцкома М. Я. ЛЯПІЛА.

В. С. ДАЛГАРУКАЎ — начальнік вучэбнага аддзела;

А. В. ЧАЛЕЙ—начальнік НДА;

С. А. ЕРАМЕЕЎ—прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце;

І. А. ЛЯПЁШКІН — начальнік аддзела аховы працы;

І. В. ГАЛАВАТЫ — начальнік службы РБ;

В. П. МАРДЫКІН—старшыня камісіі аховы працы МК;

В. І. ПРАКОШЫН—намеснік сакратара парткома;

А. М. ЖЫЛІНСКІ—старшыня прафкома БДУ;

М. І. ЦЫРУЛЬНІКАВА — загадчыца паліклінічнага аддзялення.

Калектывы факультэтаў, кафедр, навукова-даследчых лабараторый, аддзелаў адміністрацыйнай і гаспадарчай часткі і іншых падраздзяленняў універсітэта, якія дабіліся лепшых паказчыкаў па выкананню ўмоў конкурсу, узнагароджваюцца:

а) факультэт, які заняў першае месца сярод прыродазнаўчых факультэтаў, — Ганаровай граматай з прысваеннем звання «Факультэт высокай культуры вытворчасці і аховы працы па выніках конкурсу 1974 года»;

б) факультэт, які заняў першае месца сярод гуманітарных факультэтаў, — Ганаровай граматай з прысваеннем звання «Факультэт высокай культуры вытворчасці па выніках конкурсу 1974 года»;

в) кафедры, заняўшыя першыя месцы на факультэтах,—ганаровымі граматамі з прысваеннем звання «Кафедра высокай культуры вытворчасці і аховы працы па выніках конкурсу 1974 года»;

г) агульнауніверсітэцкая кафедра, заняўшая першае месца, — Ганаровай граматай універсітэта з прысваеннем звання «Кафедра высокай культуры вытворчасці па выніках конкурсу 1974 года»;

д) аддзел адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, навукова-даследчая лабараторыя і іншыя падраздзяленні універсітэта, якія дабіліся лепшых паказчыкаў, — Ганаровай граматай універсітэта.

Асобы, прыняўшыя найбольш актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзенні грамадскага агляду па культуры вытворчасці і ахове працы, узнагароджваюцца ганаровымі граматамі універсітэта.

Камісіі па арганізацыі і правядзенню конкурсу павінны падвесці вынікі у снежні 1974 года, абмеркаваўшы іх на вытворчых нарадах.

Даведкі неабходна прадставіць у мясцком да 20 снежня 1974 года.

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА

### ПАЛІТІНФАРМАЦЫЙ І ГУТАРАК СЯРОД СТУДЭНТАЎ НА ДРУГІ СЕМЕСТР 1973—1974 НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА

*ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА І ЭКАНАМІЧНАГА ЖЫЦЦЯ*

Правядзенне палітінфармацый па важнейшых падзеях палітычнага, эканамічнага жыцця ўнутры краіны, рэспублікі і за мяжой (2 разы ў месяц).

Павышэнне эфектыўнасці грамадскай вытворчасці — карэннае пытанне эканамічнай палітыкі КПСС.

Поспехі савецкага народа ў камуністычным будаўніцтве, умацаванні эканамічнай і абароннай магутнасці СССР — важнейшая ўмова захавання і ўмацавання міру на зямлі.

Пабудова камунізму ў СССР — вялікая інтэрнацыянальная задача КПСС і савецкага народа.

Клопат аб чалавеку — мэта і сэнс палітыкі КПСС.

*ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ*

Жыццё і дзейнасць У. І. Леніна як крыніца камуністычнага выхавання.

Ідэйнасць, прынцыповасць, сумленнасць — неабходныя рысы паводзін савецкага чалавека.

Як мы разумеем доўг, сумленне, гонар і маральную годнасць асобы.

З імем У. І. Леніна. (Да 50-годдзя прысваення ВЛКСМ імя У. І. Леніна).

Амаралізм буржуазнага спосабу жыцця.

*ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ*

Паслядоўная дзейнасць КПСС па здзяйсненню Праграмы міру, выпрацаванай XXIV з'ездам партыі.

Класавы, інтэрнацыяналісцкі характар міралюбівай знешняй палітыкі КПСС.

Саюз мілітарызму і манаполій — пагроза справе міру і бяспецы народаў.

Супрацоўніцтва краін СЭУ на сучасным этапе.

Ідэалагічная барацьба ва ўмовах разрадкі міжнароднай напружанасці

# ...ОБРАЯ ...АДЫЦЫЯ

— Ужо па традыцыі ў Дзень Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту СССР сустракаемся мы вось тут, на факультэце, з былымі ваеннымі журналістамі, удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны. — Гэтымі словамі адкрыў сустрэчу намеснік дэкана журфака А. І. Раковіч.

Цікава было паслухаць старэйшых таварышаў, якія маюць вялікі журналісцкі вопыт.

Перад студэнтамі выступіў Васіль Емяльянавіч Самуцін. Некалі ён рэдагаваў «Чырвоную змену». Ад яго мы даведаліся, у якіх неверагодна цяжкіх умовах выходзіла «Чырвонка» ў гады вайны. Звесткі даводзілася збіраць і перапраўляць самымі рознымі шляхамі, якія падказвала журналісцкая знаходлівасць. Расказаў Васіль Емяльянавіч і аб памылках, на якіх прыйшлося ў свой час вучыцца.

Выступіў і ўдзельнік грамадзянскай вайны, баец славутай Чапаеўскай дывізіі Якаў Ціханавіч Маставы. Ён успомніў сваё першае далучэнне да журналістыкі пад уплывам камісара Фурманава. Былы чапаевец не выпускаў з рук пяра і тады, калі вярнуўся з грамадзянскай вайны.

Прыйшоў на сустрэчу і ваенны журналіст П. Ярашэнка. Паслухалі яго будучыя журналісты і лепш уявілі сабе будні ваенных карэспандэнтаў, тыя якасці, якімі ім неабходна валодаць. Шмат карыснага ўзялі з гэтай сустрэчы журфакаўцы.

Наш кар.

# ВЫДАТНЫ ПЕДАГОГ І АРГАНІЗАТАР НАРОДНАЙ АСВЕТЫ

**26 ЛЮТАГА СПОЎНІЛАСЯ 105 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Н. К. КРУПСКАЙ.**



26 лютага 1974 года споўнілася 105 год з дня нараджэння Н. К. Крупскай —актыўнага дзеяча КПСС і Савецкага ўрада, выдатнага педагога - марксіста, таленавітага арганізатара народнай асветы, жонкі і бліжэйшага паплечніка У. І. Леніна.

Н. К. Крупская нарадзілася ў Пецярбургу ў небагатай інтэлігентнай сям'і. Бацька яе, Канстанцін Ігнатавіч, прымаў удзел у рэвалюцыйным руху і быў звязан з арганізацыяй «Зямля і воля» 60-х гадоў. У 14 год, застаўшыся без бацькі, Надзежда Канстанцінаўна, каб дапамагчы маці, стала даваць прыватныя ўрокі. У яе рана выявіліся незвычайныя педагагічныя здольнасці.

Закончыўшы ў 1887 годзе з залатым медалем прыватную гімназію Абаленскай у Пецярбургу, Н. К. Крупская паступіла на гісторыка-філалагічнае аддзяленне Бястужаўскіх жаночых курсаў. Аднак яна не знайшла ў вучобе задавальнення сваім духоўным запатрабаванням і, пакінуўшы курсы, прыняла актыўны ўдзел у рабоце марксісцкага гуртка тэхнолагаў (1890—1891 гг.) У гэтым гуртку Надзежда Канстанцінаўна ўпершыню знаёміцца з марксісцкай літаратурай, якая зрабіла на яе вялікі ўплыў.

У 1891 годзе Н. К. Крупская паступіла на работу настаўніцай у вячэрнюю нядзельную Смаленскую школу для дарослых на Шлісельбургскім тракце за Неўскай заставай (рабочы раён Пецярбурга).

Педагагічную работу яна ўмела спалучае з прапагандай марксізму. Блізка пазнаёмілася з умовамі працы і быту рабочых, устанавіла рэвалюцыйныя сувязі, а ў 1895 годзе ўступіла ў створаны У. І. Леніным пецярбургскі «Саюз барацьбы за вызваленне рабочага класа», дзе стала членам яго цэнтральнай групы.

У 1896 годзе па справе «Саюза барацьбы» Н. К. Крупская была арыштавана, а ў сакавіку 1898 года — прыгаворана да ссылкі на тры гады ў Уфімскую губерню. Аднак, з вялікай цяжкасцю, ёй удалося дабіцца дазволу адбываць ссылку ў с. Шушанскім Мінусінскага павета, дзе ў той час адбываў ссылку У. І. Ленін.

У гады ссылкі Н. К. Крупская падрыхтавала сваю першую работу — брашуру «Жанчыны - работніцы», апублікаваную пазней за мяжой і нелегальна распаўсюджаную ў Расіі. У ёй яна паказала цяжкія ўмовы жыцця жанчыны - працаўніцы ў царскай Расіі.

Пасля ад'езду У. І. Леніна за мяжу ў 1900 г. Н. К. Крупская адбывала астатні тэрмін ссылкі ў Уфе, дзе вяла падпольную работу. Пасля заканчэння ссылкі ў 1901 годзе яна таксама выехала за мяжу. Там яна становіцца верным памочнікам У. І. Леніна ў збіранні і аб'яднанні рэвалюцыйных сіл вакол нелегальнай газеты «Іскра», вядзе канспіратыўную перапіску з сацыял-дэмакратычнымі арганізацыямі Расіі, займаецца перасылкай на радзіму рэвалюцыйнай літаратуры, праводзіць арганізацыйную работу па падрыхтоўцы II з'езда РСДРП. Надзежда Канстанцінаўна ўдзельнічала ў падрыхтоўцы і рабоце III з'езда партыі, рэдагавала рэзалюцыю з'езда.

У 1905 годзе Н. К. Крупская разам з Леніным вярнулася ў Расію і прыняла ўдзел у рэвалюцыі 1905—1907 гг. У гэты перыяд яна была сакратаром ЦК партыі. І ва ўсе наступныя гады яна не толькі прымае актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай барацьбе, але і працягвае вывучаць педагагічныя праблемы, асвятляючы іх з партыйных пазіцый.

Найбольш буйной тэарэтычнай працай яе ў дакастрычніцкі перыяд з'явілася кніга «Народная асвета і дэмакратыя» (1915). У кнізе знайшлі адлюстраванне погляды К. Маркса і Ф. Энгельса на адукацыю і выхаванне падрастаючага пакалення і з марксісцкіх пазіцый высветлены галоўныя рысы новай педагогікі і школы ў будучым сацыялістычным грамадстве. Гэта першае марксісцкае даследаванне па пытаннях тэорыі і гісторыі педагогікі. У ім Надзежда Канстанцінаўна выявіла эксплуататарскі характар буржуазнай школы і даказала неабходнасць «перабудовы школы вучобы ў школу працы».

Пасля Вялікага Кастрычніка Н. К. Крупская працягвала актыўна ўдзельнічаць у стварэнні новай, сацыялістычнай сістэмы народнай асветы. З першых дзён рэвалюцыі яна загадвала пазашкольным аддзелам і была членам рэдкалегіі Наркамасветы, кіравала работай па ліквідацыі непісьменнасці, узначальвала навукова-педагагічную секцыю Дзяржаўнага Вучонага Савета. З 1929 г. Н. К. Крупская — намеснік наркома асветы РСФСР.

Не было ні адной праблемы ў галіне народнай асветы, па якой бы яна не пісала і не выступала. Найбольш буйны ўклад Н. К. Крупская ўнесла ў распрацоўку такіх важных праблем педагагічнай навукі, як вызначэнне мэт і задач камуністычнага выхавання; працоўнае выхаванне і політэхнічнае навучанне; змест разумовай адукацыі і сувязь яе з працай навучэнцаў; асновы арганізацыйных форм дзіцячага камуністычнага руху і многія іншыя.

Вялікая заслуга Н. К. Крупскай і ў тым, што яна вызначыла шляхі дасягнення галоўнай мэты. Адзін з іх — стварэнне новага зместу адукацыі і дасягненне яго разумнай арганізацыі.

Другі шлях звязан з увядзеннем у навучальны працэс працы, якую Н. К. Крупская разглядала як вялікі выхаваўчы сродак.

Пытанням політэхнічнага навучання Н. К. Крупская прысвяціла больш як 150 работ. Яна адна з першых сярод савецкіх педагогаў прыступіла да іх тэарэтычнай распрацоўкі. Але не толькі названыя праблемы цікавілі Надзежду Канстанцінаўну. Кола яе навуковых інтарэсаў вельмі вялікае. Яна адыграла выдатную ролю ў станаўленні і развіцці савецкай школы і педагагічнай навукі. Яе працы актуальны і ў сучасных умовах. Яны ўвайшлі ў залаты фонд савецкай педагогікі.

**М. ПІСКУНОЎ,**
**дацэнт, в. а. загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі.**



**Вечар у інтэрнаце не азначае, што працоўны дзень скончан. Запаўняюцца чытальныя залы: трэба падрыхтавацца да заўтрашніх семінарскіх заняткаў. Абмяркоўвае надзённыя справы студсавет.**

Фота **П. Грабенчука.**



# ДАПАМАЖЫ, ПРАФКОМ!

Мінск—горад тэатральны. І таму, зразумела, стаўшы студэнтам універсітэта, кожны імкнецца пазнаёміцца з лепшымі тэатральнымі пастаноўкамі, вакальнымі калектывамі рэспублікі і тымі, што прыязджаюць на гастролі.

Але ці заўсёды лёгка набыць студэнту білеты на цікавыя спектаклі і канцэрты?

— Не, — адказвае на гэта пытанне касір ЦТК Клаўдзія Васільеўна Бадытчык. Па агульнаму размеркаванню універсітэту дастаецца вельмі абмежаваная колькасць білетаў. Таму, таварышы студэнты, калі хочаце набыць білеты на «Дружбу» ці «Песняроў», загадзя рыхтуйце для нашай цэнтральнай тэатральнай касы свае калектыўныя заяўкі.

«Напэўна ж, думаю, гэтай справай павінен займацца прафком універсітэта. Ці шэфствуе ён як-небудзь над распаўсюджваннем, і асабліва над папярэднім набыццём білетаў для студэнтаў?». І я звяртаюся ў прафком.

— Шэфства?—перапытвае старшыня праўлення студэнцкага клуба А. Фядотаў. — Яго амаль няма. Чаму я кажу амаль? Заяўкі мы раней падавалі, аднак ад іх, як правіла, карысці было мала.

Адказ несуцяшальны. Пацвярджаюцца словы, сказаныя Валодзем Субатам, адказным за культмасавую работу на факультэце журналістыкі: «У справе распаўсюджвання білетаў зараз ніякай сапраўднай сістэмы, планавасці няма. Няма таго вывучэння запатрабаванняў, эстэтычнага густу студэнтаў, на якое мы павінны абапірацца. Даўно ўжо пара выпраўляць такое становішча».

**А. ЦЫГУЛЁЎ,**

## ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ

*У рэдакцыю працягваюць паступаць пісьмы, аўтары якіх выказваюць свае думкі і меркаванні, выкліканыя артыкулам «Ці свеціць прыгажосць усім?» (№ 29 ад 25 кастрычніка 1973 г.) Сёння мы прапануем вашай увазе некаторыя з гэтых пісьмаў.*

# НЕ ТОЛЬКІ КІНО

У адных сценах — сонца і ноч, кветкі і снег; пад адным дахам— камедыя і трагедыя, рэальнае і казачнае. Гэта мастацкія вобразы, створаныя рукой жывапісцаў і скульптараў, безыменных і вядомых, праслаўленых.

Дзяржаўны мастацкі музей БССР не можа раўняцца з буйнейшымі скарбніцамі нашай краіны, але яго наведанне прыносіць эстэтычную асалоду аматарам і знаўцам мастацтва. Пастаянная экспазіцыя музея хаця і невялікая, але ў яе каталогу лічацца работы многіх выдатных рускіх майстроў: Рэпіна, Айвазоўскага, Шышкіна, Куінджы, Паленава і інш. Да таго ж, рэгулярна арганізуюцца цікавыя выстаўкі.

Напрыклад, можна прыгадаць леташнія экспазіцыі — работы з калекцыі Арманда Хамера і малюнкі юнай мастачкі Надзі Рушавай.

Зараз у музеі экспануюцца творы сучаснага беларускага мастака А. А. Малішэўскага. Многія яшчэ не бачылі гэтай выстаўкі, бо адкрылася яна нядаўна.

Мне здаецца, большасць палотнаў (на вытворчую тэматыку і паўднёвыя пейзажы) вылучаецца свежымі спалучэннямі і проціпастаўленнямі фарбаў, часам смелымі, рэзкімі. Іншым карцінам (пераважна гэта беларускія краявіды) уласцівы мяккасць ліній, спакойныя, няяркія колеры. Карціны абагульняючага гучання («Мы вернемся», «Маткі», «Хатынь» і інш.) прасякнуты глыбокім роздумам.

Зразумела, усякая творчасць складаецца не толькі са знаходак. Наконт некаторых карцін, па-мойму, з Малішэўскім можна паспрачацца. Але нельга адмаўляць, што ён знайшоў самастойны шлях у мастацтве і ўзбагаціў беларускі жывапіс цікавымі творамі.

На жаль, пра існаванне ў Мінску мастацкага музея многія часам забываюць. Мы сочым за падзеямі тэатральнага, музычнага жыцця, кіно. А нядрэнна было б, каб і выяўленчае мастацтва ўвайшло ў кола студэнцкіх інтарэсаў.

**С. БЕРАСЦЕНЬ.**

# БЫЦЬ ГРАМАДЗЯНІНАМ

Дык чаму ж фізікі ўсё-такі не чытаюць літаратуру? Можна, канешне, спаслацца на адсутнасць часу. Але гэта толькі адгаворкі. Так, сапраўды, вучоба адбірае шмат часу. А калі ты да таго ж яшчэ і займаешся грамадскай работай або ў СНТ, то часу амаль не застаецца. Амаль, таму што пры жаданні час заўсёды можна знайсці.

Нельга сказаць, што кніг наогул не чытаюць. Іх чытаюць нават на лекцыях, употай ад выкладчыка. Пытанне ў тым, што чытаюць? А чытаюць у большасці выпадкаў дэтэктыўныя раманы. Чаму іменна іх? Ды таму, што яны не патрабуюць роздуму, аналізу, работы думкі, як, напрыклад, творы класікаў. Хаця мозг чалавека ўсемагутны, але і ён не выносіць перагрузак. Таму пасля вучэбнай літаратуры куды прыемней прачытаць кнігу, насычаную вострасюжэтнымі падзеямі. Яна хоць і мала дае карысці, затое расслабляе, знімае стомленасць.

І ўсё ж студэнты павінны чытаць мастацкую літаратуру, прычым чытаць не толькі тады, калі гэта «здаецца ім патрэбным». Студэнт перш за ўсё грамадзянін, а ўжо потым навуковы супрацоўнік. Абмежаванне навукай прыводзіць да раўнадушша ў грамадскім жыцці — хваробы, з якой нялёгка змагацца.

Многія з нас, студэнтаў-хімікаў, пасля заканчэння універсітэта стануць інжынерамі на прадпрыемствах, узначаляць цэлыя калектывы. І трэба загадзя рыхтавацца адказаць на пытанні «што ёсць што?».

**В. БУДЗЬКО,**
**студэнт хімфака.**

# АХОВА ПРЫРОДЫ Ў ШКОЛЕ



У снежні мінулага года на паліцах кніжных магазінаў з'явілася кніга Т. І. Жукавай «Гадзіны займальнай заалогіі», выдадзеная выдавецтвам «Асвета». Эпіграфам да гэтай кнігі можна было б паставіць словы аўтара: «Выхаванне ў дзяцей беражлівых адносін да прыроды—адна з важнейшых задач настаўніка біялогіі».

Ахова прыроды—вострая праблема сучаснасці. Зараз выпушчана вялікая колькасць кніг, надрукавана многа артыкулаў па ахове прыроды. Некаторыя аўтары з жахам усклікаюць, што чалавецтва загіне пад цяжарам цывілізацыі. Але большасць біёлагаў глядзіць на пытанне аховы прыроды рэальна. Яны бачаць ход працэсу змянення біясферы, але вераць у магутнасць розуму.

У наш час ахова прыроды — справа ўсенародная. Выхаваць правільныя адносіны да прыроды заклікана школа.

Цікавы вопыт ёсць у маскоўскіх школ. Настаўнікі біялогіі ў час загарадных прагулак знаёмяць рабят не толькі з цікавымі відамі раслін і жывёл, але і вучаць дзяцей любіць прыроду, вучаць бачыць яе прыгажосць. Яны дапамагаюць рабятам знаходзіць цікавыя сучкі і карчажыны, убачыць у невялікім кавалачку дрэва, грыба сюжэт любімай казкі, любімага героя. Пасля такіх прагулак рабяты прывыкаюць шукаць у прыродзе цікавае, а не разбураць гнёзды, знішчаць карысных жывёл.

У Маскве на вуліцы Разіна побач з гасцініцай «Расія» ў студзені гэтага года адкрылася Усесаюзная выстаўка «Ахова прыроды—вачамі дзяцей». На выстаўцы сабраны малюнкі, скульптуры, дзіцячыя вырабы. Найбольш цікавыя работы—маскоўскіх школьнікаў. Няма толькі на выстаўцы работ навучэнцаў БССР.

На жаль, у школах г. Мінска і іншых школах Беларусі падобны від нагляднай агітацыі практыкуецца слаба, пераважна ў малодшых класах. А рабятам жа гэта было б вельмі цікава і карысна.

Мы праходзілі педагагічную практыку ў сярэдняй школе № 27. Настаўніца біялогіі К. Н. Мазуркевіч — цікавы, вопытны, шматгранны педагог. На яе ўроках тэма аховы прыроды была самай важнай, і таму не дзіўна, што рабяты старэйшых класаў вырашылі да тыдня біялогіі зрабіць падарунак школе — падрыхтаваць альбом «Ахова прыроды».

**Е. КУШНЕР,**
**студэнтка V курса біяфака.**



**Вечарам ярка запальвае агні гэты вялікі дом — інтэрнат № 7 па вуліцы Кастрычніцкай. Вяртаюцца з заняткаў яго жыхары-студэнты. Перш за ўсё — павячэраць. А калі на кухні ёсць газавыя пліты, гэта не праблема.**

# СЕМ ДЗЁН У ДАРОЗЕ

**Мы — 480 студэнтаў розных вну горада зырашылі сем дзён канікул правесці ў дарозе. Наш дом — турпоезд «Беларусь», які вечарам першага лютага паімчаў нас з Мінска. Наперадзе — Карпаты.**

### ДЗЕНЬ ПЕРШЫ

Першы вечар прайшоў у клопатах: усе старанна перасяляліся з вагона ў вагон, знаёміліся, абжываліся. Я трапіла ў вагон № 5. Тут жывуць студэнты МДПІ. Выбралі старасту: цяпер ён наш «цар і бог».

Гэтым жа вечарам па радыё быў праведзен конкурс «Алё, мы шукаем таленты!» Для пачатку нядрэнна. А што будзе заўтра?

### ДЗЕНЬ ДРУГІ

Мы на Украіне. Львоў сустрэў нас цёплым надвор'ем. Старажытныя дамы, касцёлы, саборы — святой Елізаветы, святога Юлія, Высокі Замак. Гэта — стары Львоў. Яго вулачкі самыя вузкія ў Саюзе. Па іх ходзяць трамваі, зробленыя па спецыяльнаму заказу ў ГДР. Прыгожы па-свойму і новы горад. За горадам — Курган Славы, дзе пахаваны воіны, якія загінулі ў баях за вызваленне Радзімы. Тут жа знаходзіцца магіла савецкага разведчыка Кузняцова. Штогод з'язджаюцца сюды яго землякі.

Вялікую каштоўнасць прадстаўляе львоўскі музей украінскага мастацтва, дзе сабраны каштоўныя калекцыі твораў старажытнага мастацтва XII—XIV стагоддзяў і украінскага савецкага прафесійнага мастацтва.

Запомнілася ўсім і вядомая львоўская аптэка-музей, заснаваная ў XVIII стагоддзі.

У горадзе многа вну, тэхнікумаў, вучылішч. Вялікі старадаўні будынак Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя І. Франка, новы, са шкла і бетону, корпус ордэна Леніна політэхнічнага інстытута... Ці можна за адзін дзень агледзець усё! Не бяда — мы вернемся ў Львоў на зваротным шляху.

### ДЗЕНЬ ТРЭЦІ

Старажытны Ужгарад... Пачатак лютага — а ў горадзе зеляніна. Тут сабраны дрэвы розных краін свету: японская айва, сакура, магнолія, цюльпанавае дрэва, самшыт...

Нас, зразумела, зацікавіў Ужгарад універсітэцкі, студэнцкі. Звярніце ўвагу: на 65 тысяч жыхароў горада прыходзіцца 11 тысяч студэнтаў універсітэта. Універсітэт мае 12 факультэтаў, 61 кафедру, батанічны сад, заалагічны, анатамічны і мікрабіялагічны музеі, вылічальны цэнтр, лабараторыю касмічных даследаванняў.

Ужгарад —пагранічны горад. Тэрыторыя побач з Чэхаславакіяй. Мы пабывалі на граніцы. Тут пастаўлен помнік савецкім воінам — «Украіна — вызваліцелям». Штогод на граніцы, паблізу Ужгарада, сустракаюць і праводзяць эстафету дружбы і міру з Масквы ў Прагу і з Прагі ў Маскву. Недалёка ад горада граніцу перасякаюць трасы нафтапровада «Дружба», газапровада «Брацтва» і энергалініі «Мір».

Пабывалі мы і на тэрыторыі міжнароднага студэнцкага лагера. Побач з ім старажытны замак X—XVI ст. У народзе яго называюць замкам Паганай Дзевы, па імю ўладальніцы замка, аб якой у народзе ходзяць страшныя легенды.

На гербе горада — сонечная гронка ягад — Ужгарад здаўна славіўся вінаграднікамі і вінаробствам.

### ДЗЕНЬ ЧАЦВЁРТЫ

Некалькі гадзін язды —і мы ў Мукачава. Чым запомніўся гэты горад? Цудоўным сярэдневяковым замкам. Ні разу не ўдавалася захопнікам узяць яго прыступам.

З замка, які размешчан на высокім узгорку, адкрываецца агульны выгляд горада. Горад невялікі, але ўтульны, светлы, прыветлівы. Працякае тут рака з паэтычнай назвай Латорыца.

У прыгарадзе Мукачава размешчан цудоўны санаторый «Карпаты». Непадалёку — база адпачынку львоўскіх студэнтаў.

На шляху нам сустрэлася «Крыніца прыгажосці». Легенда расказвае: хто нап'ецца вады з яе, будзе ўсё жыццё маладым, здаровым і прыгожым. Сапраўды, вада ў крыніцы надзвычай смачная. Набраўшыся здароўя на 100 год, мы адправіліся далей.

Наш вагон — 5 рабят і 31 дзяўчына — стаў ужо невялікім калектывам. Вечарам збіраемся ў купэ, да позняй ночы расказваем гісторыі са студэнцкага жыцця, успамінаем сесію, пакуль інструктар або староста Валянцін Арлоў не «разгоніць» усіх па сваіх купэ. Мы хвалюемся за сваіх, калі па радыё перадаюць рэпартаж з шахматна-шашачнага турніру паміж камандамі вагонаў. Пакрысе збіраем матэрыял для будучай насценгазеты.

### ДЗЕНЬ ПЯТЫ

Ранкам, калі мы выйшлі з вагона, убачылі завесу туману. Ён патроху рассейваўся, і перад вачыма прадсталі велічныя, пакрытыя снегам сівыя вяршыні. Рахаў — зусім невялікі гарадок, што размясціўся над Цісай. Раку назвалі так таму, што на берагах яе калісьці расло многа ціса. Цяпер у горадзе не засталося ніводнага дрэва-прыгажуна.

Тыя пачуцці, якія засталіся ў нас пасля «пакарэння», здавалася б, невялікай вяршыні, перадаць немагчыма. Сапраўды, «лучше гор могут быть только горы...»

«Туман, які павольна выпаўзаў з лагчын, падымаўся ўгору, да нашых ног. Да вяршыні засталося яшчэ столькі ж, колькі было пройдзена. Наперадзе— самы круты ўздым. Снегу стала больш. Правальваючыся, мы амаль паўзком прабіраліся ўсё вышэй і вышэй, пакуль масіўны зараснік ёлак і букаў поўнасцю не схаваў ад нас доўгачаканую вяршыню...» — так апісаў свае ўражанні наш староста Валянцін у насценнай газеце. Дапазна пісалі мы фантастычнае апавяданне «Турызм — гэта не трэсачкі», гістарычную хроніку «Ну, погоди»!

### ДЗЕНЬ ШОСТЫ

...Ранкам нас, як звычайна, пабудзіў інструктар Леанід Ільіч «меладычным» пастукваннем чымсьці металічным аб дзверы купэ.

Зноў Львоў. Заўтра мы будзем у родным Мінску. Экскурсіі ў горад сёння няма. Заканчваем газету.

Вечар. Апошні вечар на Украіне. Усім крышачку сумна. Зноў сабраліся ў купэ, спяваем песні. Па радыё аб'явілі аб тым, што наша газета заняла трэцяе месца з 12 магчымых.

Падарожжа падышло к канцу. У памяці застаўся цудоўны край — Закарпацце, гасцінны ўкраінскі народ. Засталіся новыя знаёмыя — староста Валік Арлоў, яго сябры Жэня і Наташа, галасістыя Зоя Казалук і Оля Маўшовіч, неразлучныя Таня і Сярожа, мае цудоўныя суседкі па купэ Люда, Галачка і Валя... І я ўпэўнена, што, сустрэўшыся, мы ўспомнім свой вагон № 5 і сем дзён, праведзеных у дарозе...

**Н. НОВІКАВА.**



Інтэрсектар камітэта камсамола і дэканат па навучанню замежных студэнтаў праводзяць конкурс на лепшае сачыненне, песню і малюнак «Мой другі дом — краіна Ільіча», прысвечаны 104-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.

Устаноўлены тры асноўныя і два заахвочвальныя прызы.

Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца да 1 красавіка ў дэканаце па навучанню замежных студэнтаў.



Спяваюць удзельнікі вакальна-інструментальнага ансамбля «Акварэлі» Калінінградскага універсітэта.

# МАЦНЕЕ ДРУЖБА

Сяброўскія сувязі паміж студэнцкімі мастацкімі калектывамі Беларускага і Калінінградскага універсітэтаў існуюць ужо некалькі год. Паездкі з выступленнямі студэнтаў умацоўваюць дружбу, узбагачаюць творчы рэпертуар.

Сёлета студэнцкі тэатр эстрадных мініяцюр Калінінградскага універсітэта адзначыў сваё дзесяцігоддзе. Да гэтага юбілею самадзейныя артысты падрыхтавалі новы рэпертуар. З ім і прыехалі калінінградцы ў Мінск, каб выступіць перад студэнтамі.

На сцэне дзявочая вакальная група. Яны пачынаюць прадстаўленне песняй А. Новікава «Дарогі». Задушэўныя словы і цудоўная музыка зачароўваюць гледача. Песню аб маці, якая чакае сына і не хоча верыць, што ён загінуў на вайне, выканаў аўтар В. Ягораў.

На змену песням прыходзіць жвавы «Казачок». Пасля матроскага танца на сцэне з'яўляюцца хлопцы і дзяўчаты ў жоўтых кашулях. Гэта — стэмаўцы (акцёры студэнцкага тэатра мініяцюр). У іх выкананні мы ўбачылі сцэнкі са студэнцкага жыцця — з заліковымі кніжкамі, экзаменамі, практыкай...

Песняй «Акварэлі», якую стварыў удзельнік мастацкай самадзейнасці, пачаў знаёмства з гледачамі аднайменны вакальна-інструментальны ансамбль.

Жыццярадаснасць студэнцкіх год, іх непаўторнасць, шматграннасць цудоўна змаглі перадаць на сцэне кіраўнік студэнцкага тэатра А. М. Міхайлаў і рэжысёр Л. А. Сцяпанаў.

Узнагародай за шчырасць у выступленнях былі гарачыя апладысменты ўдзячных гледачоў. А ў знак дружбы паміж нашымі навучальнымі установамі кіраўніку мастацкай самадзейнасці сяброў была ўручана кніга аб нашым універсітэце.

**Л. НОВІКАЎ,**
**студэнт.**

**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Аб'ём — 1 друк. ар.
Газета выходзіць па чацвяргах.
Тыраж 2000 экз.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 06611

Зак. 291.